УДК 37.017.4

# КРАЯЗНАЎСТВА ЯК КРЫНІЦА ВЫВУЧЭННЯ ГІСТОРЫІ РОДНАГА КРАЮ

**Алянюк Г. А.**
Сярэдняя школа № 1 г. Бялынічы
імя Мікалая Іванавіча Пашкоўскага
(г. Бялынічы, Магілёўская вобласць, Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле разгледжана значэнне выкарыстання краязнаўчага матэрыялу ва ўрочнай і пазаўрочнай дзейнасці ў школе.
Ключавыя словы: Краязнаўства, гісторыя, родны край, музей.
Summary. The article considers the importance of the use of local history material in the classroom and extracurricular activities at school.
Keywords: Local history, history, native land, Museum.

Кожны чалавек душой прырастае да таго куточка роднай зямлі, дзе ен нарадзіўся, правёў сваё маленства, юнацтва, дзе жывуць родныя і блізкія людзі. Родная зямля дае нам сілы пераадолець жыццёвыя перашкоды, знайсці выйсце са складанай жыццёвай сітуацыі. І кожны з нас, жывучы ў горадзе ці вёсцы, несумненна імкнецца ведаць як мага больш пра свае родныя мясціны, пра побыт, традыцыі, фальклор нашых продкаў, пра архітэктурныя помнікі, пра знакамітых людзей-землякоў. Вывучаючы краязнаўчы матэрыял, мы пазнаем нашу гісторыю, гісторыю зямлі беларускай. Меў рацыю славуты беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч, адзначаючы: «Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе. Хто забыў сваю мову – усё згубіў». Помніць і даражыць сваімі каранямі – святы абавязак сумленнага чалавека, сапраўднага сына роднай зямлі.

Згодна з Энцыклапедыяй гісторыі Беларусі, «краязнаўства Беларусі – вывучэнне элементаў гісторыі, геаграфіі, культуры, побыту, прыроды Беларусі ў цэлым, ці ж горада, мястэчка, вёскі, помнікаў культуры і г. д.» [1, с. 257]. У самім тэрміне «краязнаўства» заключана яго вызначэнне: знаць край, вывучаць гістарычнае мінулае, побыт жыцця, традыцыі, абрады, рэлігійныя вераванні, архітэктурныя помнікі…

Краязнаўства – гэта навука, якая даследуе сістэму ведаў пра пэўную тэрыторыю, вывучае гістарычныя, палітычныя, культурныя, прыродныя і іншыя фактары яе фарміравання і развіцця. Формы арганізацыі краязнаўства і краязнаўчай работы маюць розны маштаб: адрозніваюць дзяржаўнае, грамадскае і школьнае краязнаўства. Трэба зазначыць, што менавіта школьнае краязнаўства валодае найбольшымі магчымасцямі для прыцягнення шырокіх колаў школьнікаў розных узростаў да захавання і развіцця гісторыі і культуры краіны. У школе на вучэбных занятках па літаратуры, мове, гісторыі выкарыстоўваюцца краязнаўчыя матэрыялы пра гісторыю ўзнікнення паселішча Бялынічаў, пра будаўніцтва Бялыніцкага кляштара кармелітаў, цікавыя фальклорныя творы, запісаныя ў час экспедыцый па родным Прыдруцкім краі. Шмат пазнавальнага для нашых вучняў у часе падрыхтоўкі і правядзення пазакласных мерапрыемстваў: завочных падарожжаў па родных мясцінах, складанне карт знаходжання архітэктурных помнікаў. У гэтым не толькі памяць пра нашых продкаў, але і яскравы прыклад іх творчасці, майстэрства, працавітасці і натхнення.

Выхаваўчая значнасць такой работы праяўляецца ў фарміраванні свядомага стаўлення моладзі да краязнаўчай работы, асэнсаванні яе важнасці для выяўлення, фіксацыі, збору і класіфікацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Краязнаўчы матэрыял на ўроках выкарыстоўваецца ў працэсе выкладання шэрагу тэм розных вучэбных дысцыплін. Вельмі карысным для прывіцця любові і павагі да роднага краю з'яўляецца арганізацыя і правядзенне краязнаўчых паходаў, экскурсій, экспедыцый.

У нашай школе працуюць два музеі: літаратурна-краязнаўчы «Спадчына» і гісторыка-краязнаўчы. Роля музея ў захаванні агульначалавечай спадчыны, бясспрэчна, вялікая. Музей ўстановы адукацыі заўсёды вырашае шэраг вучэбна-выхаваўчых задач. Формы і метады класнай і пазакласнай работы, якая ўключае музейны матэрыял у вучэбны працэс даволі разнастайныя: вучэбная экскурсія; урок-экскурсія; выкарыстанне музейных прадметаў у якасці вучэбных дапаможнікаў на ўроках; падрыхтоўка паведамленняў, неабходных для ўрока па заданні настаўніка, на аснове самастойнай работы ў музеі; школьныя таварыствы, аб'яднанні.

Літаратурна-краязнаўчы музей «Спадчына» адкрыты 25 чэрвеня 2010 г.

**Асноўныя раздзелы экспазіцыі музея:**
1. Пісьменнікі Прыдруцкага краю.
2. Краязнаўства.
3. Літаратурнае аб'яднанне «Натхненне».
4. Каласкі маладых.

Музей мае бібліятэку, дзе захоўваюцца мерапрыемствы вечарын, гасцёўняў, папкі літаратурнага аб'яднання «Сцяжынкамі натхнення». Колькасць экспанатаў – 165 асноўнага фонду і 100 дапаможнага фонду.

З 2004 года вялася карпатлівая праца па стварэнні літаратурна-краязнаўчага музея «Спадчына». Быў сабраны і сістэматызаваны матэрыял пра пісьменнікаў Прыдруцкага краю, які выкарыстоўвалі ў сваёй рабоце настаўнікі беларускай мовы і літаратуры.

Савет музея вядзе перапіску з земляком паэтам-фантавікам Алегам Пліндовым, які пражывае ў Гомелі. Дзякуючы яго лістам, успамінам ёсць магчымасць прасачыць тэму Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці паэтаў-землякоў.

Літаратурныя сустрэчы з Міколам Падабедам, членам Саюза журналістаў Беларусі, членам Магілёўскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, даюць уяўленне пра літаратуру ў жанры гумару.

Гутаркі, інтэрв'ю з рэдактарам раённай газеты «Зара над Друццю» Міхасём Карпечанкам з'яўляюцца частымі формамі работы Савета музея. Як вядомы краязнаўца, ён знаёміць з напрацоўкамі з архіўных дакументаў. Савет музея сабраў багаты матэрыял рубрыкі «Бялыніччына літаратурная».

Гісторыка-краязнаўчы музей быў адкрыты школе 8 мая 1984 г. да 40-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Экспазіцыя музея змяшчае гістарычныя матэрыялы Бялыніччыны. Сярод раздзелаў музея вылучаюцца наступныя:
а) Подых сівой гісторыі;
б) Бялыніцкі манастыр;
в) У складзе Расійскай імперыі;
г) Яны загінулі ў Афганістане.

Найбольш каштоўнымі экспанатамі краязнаўчай экспазіцыі з'яўляецца кніга «Падарожжа ў Татарыю» 1804 г., часопісы «Ніва» № 26 за 1899 г. і № 4 за 1900 г., карта Старажытнай Польшчы 1859 г. У фондах захоўваюцца дакументы, звязаныя з перапіскай ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, лісты, выпіскі з архіваў. У асноўным фондзе гісторыка-краязнаўчага музея знаходзіцца 398 экспанатаў, у дапаможным – каля 100 экспанатаў.

Матэрыялы з музеяў з'яўляюцца каштоўным сродкам фарміравання ў нашых вучняў грамадзянскай пазіцыі, любові да роднай зямлі, гонару за нашых землякоў, беражлівых адносін да спадчыны бацькоў.

Падчас краязнаўчай работы ў дзяцей фарміруецца інтарэс да вывучэння гісторыі краіны, роднага горада, вёскі. Любоў да Радзімы пачынаецца з канкрэтных ведаў пра вуліцу, раён, горад, вёску, дзе мы жывём.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што краязнаўчая работа, арганізаваная ў школе, мае важнае значэнне ў станаўленні грамадзянскай пазіцыі нашых вучняў, фарміраванні ў іх павагі і пашаны да здабыткаў беларускага народа, спрыяе выхаванню зычлівасці, спагадлівасці, высакароднасці.

**Літаратура:**


1. Краязнаўства // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн.: БелЭн, 1997. – Т. 4. – С. 257–260.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова